ЗАЦВЯРДЖАЮ
начальнік аддзела ідэалагічнай работы,
культуры і па справах
моладзі Навагрудскага райвыканкама
___________М.К.Шабановіч
“___”___________2017г.

# КНІЖНЫ ГЕРОЙ

## ПАЛАЖЭННЕ
## аб конкурсе лялек сваімі рукамі



**Навагрудак, 2017**

**Лялька** - адна з самых старажытных форм творчасці. На працягу стагоддзяў яна змянялася разам з усёй народнай культурай, убіраючы ў сябе яе нацыянальныя асаблівасці, і набывала своеасаблівасць. Лялька з'яўляецца традыцыйным, неабходным элементам выхаваўчага працэсу.

**Дэвіз конкурсу**: «Хто ў лялькі не гуляў, той шчасця не бачыў».

**Заснавальнік конкурсу**:
аддзел бібліятэчнага маркетынгу ДУК "Навагрудская раённая бібліятэка"

**1. Агульныя палажэнні**
**1.1.** Сапраўднае палажэнне вызначае парадак правядзення конкурса па вырабу лялек, якія з'яўляюцца літаратурнымі героямі беларускіх мастацкаіх твораў ці казак.
**1.2.** Конкурс арыентаваны на развіццё чытацкага інтарэсу, творчасці і асобасных магчымасцяў удзельнікаў.

**2. Мэты і задачы конкурса:**
**2.1.** Мэты:
**2.1.1**. Арганізацыя лялечнага тэатра ў ДУК "Навагрудская раённая бібліятэка".
**2.2**. Задачы:
**2.2.1.** Развіццё цікавасці да літаратуры і народнай творчасці.
**2.2.2.** Прыцягненне ўвагі да праблем захавання і развіцця нацыянальнай культуры.
**2.2.3.** Павышэнне сацыяльнага статусу бібліятэк, актывізацыя іх дзейнасці як адукацыйных і культурна-забаўляльных цэнтраў для насельніцтва;
**2.2.4.** Падтрымка і стымуляванне інавацыйнай дзейнасці.
**2.2.5.** Абнаўленне зместу дзейнасці бібліятэк, удасканаленне іх метадычнага забеспячэння, абагульненне і распаўсюджванне станоўчага вопыту.

**3. Удзельнікі**
У конкурсе прымаюць удзел чытачы і бібліятэкары структурных падраздзяленняў ДУК "Навагрудская раённая бібліятэка".

**4. Тэрміны правядзення**
Выраб лялькі – 27 студзеня - 30 сакавіка 2017 года.
Выстава работ - 01-30 красавіка 2017 года.
Кніжны фэст літаратурных герояў "Літара" – 01-31 жніўня 2017 года.
Арганізацыя ЛіТэатра "Церамок" – 01-31 ліпеня 2017 года
Падвядзенне вынікаў Конкурса 01 – 15 верасня 2017 года.

**5. Арганізацыя Конкурса**
**5.1**. Для ўдзелу ў конкурсе прымаюцца лялькі ў касцюмах казачных або літаратурных герояў беларускіх твораў (вышыня лялькі не менш 20 см).
**5.2.**Экспанаты могуць быць выкананы ў наступных тэхніках: панчошныя лялькі, лялькі з папье-машэ, з пластыка, тканіны, вязаныя кручком ці пруткамі і інш.

**5.3.** Конкурс праходзіць у некалькі этапаў:
**5.3.1.** Выраб конкурснай работы - з моманту абвяшчэння конкурса да 31 сакавіка 2017 года (гатовую лялльку здаць не пазней 30 сакавіка 2017 г.).
**5.3.2.** З 01 па 30 красавіка ў чытальнай зале Навагрудскай раённай бібліятэкі арганізуецца выстава лялек сваімі рукамі. Адначасова праводзіцца апытанне наведвальнікаў выставы, журы конкурсу робіць свае вывады.

Конкурсная выстава прадугледжвае наяўнасць:
- лялькі, якая з’яўляецца персанажам любой беларускай казкі ці мастацкага твора;
- распрацаванага сертыфіката (назва лялькі, матэрыял, як з ёй можна гуляць ці выкарыстоўваць у тэатральнай дзейнасці, магчымыя дадатковыя звесткі: казкі, вершы, песні, дыялогі ўласнага сачынення для выкарыстання ў гульнявой дзейнасці).
**5.3.3**. З 01 мая па 30 чэрвеня лялькі аб’ядноўваюцца па сюжэту, падбіраецца твор для пастаноўкі спектакля. Адначасова адбіраюцца ўдзельнікі кніжнага фэсту “Літара”.
**5.3.4**. З 01 па 31 ліпеня - арганізацыя ЛіТэатра “Церамок”, правядзенне рэпетыцый спектакляў.
**5.3.5**. З 01 па 31 жніўня - падрыхтоўка і правядзенне кніжнага фэста літаратурных герояў “Літара” .
**5.3.6**. З 01 па 14 верасня - падвядзенне вынікаў конкурса.
**5.3.7.** Узнагароджванне пераможцаў адбудзецца 15 верасня падчас святкавання Дня бібліятэк

**6. Падвядзенне вынікаў**
**6.1**. Журы будзе ўлічваць:
• выкананне тэрмінаў прадстаўлення матэрыялаў па патрабаваннях Конкурса
• жанр і тэхніку выканання лялькі, якая выбіраецца аўтарамі
• выкарыстанне экалагічна чыстых матэрыялаў
• адпаведнасць названага памеру лялькі
• эстэтыку выканання
• магчымасць выкарыстання лялькі ў дзейнасці бібліятэкі
• удзел дзяцей у стварэнні лялек.
**6.2**. Журы вызначае пераможцаў Конкурса па наступных намінацыях:
"Лялька - літаратурны (казачны) герой" (1 месца, 2 месца, 3 месца).
"Лялькі для ЛіТэтра" (1 месца, 2 месца, 3 месца).
"Батлейка" (1 месца, 2 месца, 3 месца).
**6.3.** Па выніках конкурса вызначаюцца па тры пераможцы, якім прысуджаюцца 1-е, 2-е, 3-е месцы па кожнай намінацыі. Яны ўзнагароджваюцца дыпломамі і каштоўнымі падарункамі.
**6.4.** Журы мае права дадаткова адзначыць лепшыя лялькі (прыз сімпатый журы), альбо не прысуджаць месца пры адсутнасці годных экспанатаў.

**Склад арганізацыйнага камітэта :**

1. Малюжэнец Ф.А., загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу.
2. Івашкевіч С.І., галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу.
3. Жых В.К., метадыст І кат. аддзела бібліятэчнага маркетынгу
4. Янушкевіч А.В., бібліятэкар ІІ кат. аддзела бібліятэчнага маркетынгу.

**Склад журы:**

1. Шабановіч М.К. - начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Навагрудскага райвыканкама (старшыня).
2. Царук І.М., дырэктар ДУК “Навагрудская раённая бібліятэка”.
3. Старадымава І.В., наместнік дырэктара ДУК “Навагрудская раённая бібліятэка”.
4. Клімко Н.А., дырэктар Навагрудскага цэнтра рамёстваў.
5. Лівнік С.Н., загадчык аддзела раённага цэнтра культуры